# Запіскі [пра неразуменьне Я. Пільным кнігі Я. Пушчы „Дні вясны“]

Ацэньваючы той ці іншы твор, мы фактычна ацэньваем (прыпісваем прэдыкат цэннасьці) або непасрэднае перажываньне, як яно ўяўляецца нам, або пераўтварэньне гэтага перажываньня (вынутыя з непасрэднага перажываньня элемэнты). Адсюль калі чалавек гаворыць, што твор прыгожы ці няпрыгожы (часта ўжываюць эт[ыкеткі]–п[рыметнікі] „добры“, „кепскі“), то гэтым самым ён ацэньвае не самы твор, а сваё перажываньне ці, дакладней, уяўленае ім уласнае перажываньне, якое выклікана было ў яго дачыненьні да твору. (Прыкл[ад]. Некі Я. Пільны (З. Ж[ылуновіч], або Ц. Г[артны], або С. Д[рук]) выказаў такое суджэньне: „творы Я. Пушчы — хворыя, упадачныя“. Гэта значыць, уяўленае Я. Пільным яго ўласнае перажываньне, якое было ў яго дачыненьні да твораў Пушчы, ён (Пільны) ацаніў як хворае, г. зн. ненармальнае. Гэта, вядома, яшчэ ня вызначае цэннасьці самых твораў, а толькі паказвае на ўласьцівасьць іх выклікаць у такіх асобах, як Я. Пільны, ненармальнае перажываньне. Цэнная–ж гэта ўласьцівасьць, ці не — гэта ўжо пытаньне другога парадку, і ўстанаўліваецца яна (цэннасьць) у рэзультаце ўстанаўленьня, якія (якога характару) перажываньні такіх асоб, як Я. Пільны, у даным разе яны лічаць за нармальныя і наскольні нармальнае („здаровае“) у іх разуменьні об'ектыўна зьяўляецца здаровым ці наскольні „хворае“ у іх разуменьні об'ектыўна зьяўляецца хворым. З рэц[энзіі] Пільнага чытач даведваецца, што Піл[ьны] лічыць за „хворае“ перажываньне неразуменьня твору. Так развaж[аючы], можна сказаць, што перажываньне неразуменьня наогул чаго–небудзь ёсьць зьява хворая і што чалавек павінен перажываць толькі разуменьне. Што гэта супярэчыць прыродзе чалавека — ясна кожнаму. Нармальны чалавек перажывае і неразуменьне, і разуменьне, і першае — заўсёды, калі ён дачыняецца да новага невядомага яму з ранейшай практыкі прадмету. Але ніхто і ніколі ня лічыў гэтага за хворае. Кожны лічыць гэта звычайнаю зьяваю. Наадварот, хворым зьявішчам будзе гаварыць аб незразумелым як зразумелым і называць яго хворым толькі таму, што яно незразумела і нежаданьне зразумець незразумелае. Калі што для нас і незразумела, то перш чым аб ім гаварыць і называць яго хворым, трэба ўсё–ж яго зразумець, іначай як можна сказаць, што яно хворае ці здаровае, добрае ці кепскае? Хто–ж незразумелае яму называе хворым толькі таму, што яно яму незразумела, у тым у праве мы ўсумніцца, ці здаровы ён сам.)

*[1927]*